# АДМЕТНАСЦЬ РАСКРЫЦЦЯ ТЭМЫ КАХАННЯ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «СЦЮЖА»

***В.Д. Бусел***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці В. Быкава «Сцюжа» даследуецца спецыфіка раскрыцця праблемы ўзаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай на фоне сацыяльных пераўтварэнняў 1930-х гадоў. Характарызуюцца вобразы галоўных герояў твора.

**Ключавыя словы:** В. Быкаў; каханне; жанчына; пачуцці; аповесць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У беларускай літаратуры тэма кахання нярэдка раскрываецца на фоне вясковага жыцця. Шматлікія майстры беларускага слова ўплятаі пачуццёвую лінію ў палатно сялянскага мікракосмасу, малюючы вобразы жанчын, якія імкнуліся стварыць уласнае гняздо. Рух іх жыццяў абумоўліваўся традыцыйным народным светапоглядам, які прадвызначаў свет іх памкненняў і жаданняў.

Васіль Быкаў на старонках аповесці «Сцюжа» прапануе прынцыпова іншы погляд на раскрыццё тэмы пачуццяў. Аўтар паказвае адрозную ад традыцыйнай мадэль адносінаў паміж жанчынай і мужчынам, дае зразумець, што бальшавіцкая ідэалогія, нібы спрут, прасякнула ўсе бакі жыцця грамадства. Каханне, якое ў ранейшыя часы лічылася прыватным, патаемныя бокам, набывае новыя рысы: выкарыстоўваецца як інструмент ідэалагічнай апрацоўкі.

Творчасць В. Быкава ва ўспрыманні масавага чытача неаддзельная ад ваеннай тэмы. Пісьменніка часта ўспрымаюць як летапісца вайны, аднак, на нашу думку, пры гэтым ён – сапраўдны майстар тонкага псіхалагізму, які глыбока і дакладна раскрывае характары людзей на фоне сацыяльных і грамадскіх змяненняў народнага жыцця.

Аповесць «Сцюжа» – гэта адзін з твораў, дзе вайна фактычна адыходзіць на другі, ці нават на трэці план: асноўная ўвага надаецца паказу сацыяльных перамен у грамадстве напярэдадні вайны. Аўтар выкрывае заганныя бакі ідэалогіі камунізму, паказвае яе разбуральны ўплыў на светапогляд беларусаў.

Па нашым меркаванні, «сцюжа» – глыбока метафарычны вобраз. Гэта перш за ўсё выява стану чалавечай душы, скалечанай ідэалагічнай апрацоўкай, антыгуманнымі рэпрэсіямі, трывалым пачуццём падазронасці, прадчуваннем скорай расправы.

Аўтарская філасофія перадаецца праз галоўнага героя Ягора Азевіча, праз яго адносіны са светам. Блукаючы ў цемры ўласнага жыцця, ён імкнецца пазбавіцца нясцерпнай «сцюжы», якая з'явілася ў яго сэрцы разам са зменай месца жыхарства і сацыяльнага статусу, з прыняццем ідэалаў новага дзяржаўнага ладу.

Сцюжа – гэта яшчэ і стан прыроды, пры якім параненага ў час вайны Азевіча адольваюць успаміны: «*Халера, як бы не захварэць, – падумаў ён першы раз, – нешта ўсё не мог сагрэцца. Але не дзіва – намерзся ў хвойніку ды і наогул накалеўся за восень у лесе. Можа, таму так доўга не мог выгнаць з сябе сцюжы*» [1].

Аўтар неаднойчы падкрэслівае знішчальны ўплыў новай улады. Асабліва пакутуюць праз яе колішнія сяляне-землеўласнікі, а зараз – калгаснікі. Людзі супраціўляюцца новым стандартам, імкнуцца захаваць сваю гаспадарку, якая неадрыўна звязана з нутром сялянскай душы. Сяляне клянуць новых кіраўнікоў, адракаюцца ад навязанай ім «волі»: «*Канешне, небагата, бедна жылі, хлеба хапала толькі да вясны. Бульбы таксама. Але пра тое тады не надта каб гаварылі, дбалі аб адным: як даць план, выканаць пастаўкі, сплаціць падаткі, самаабкладанне, заём. Лічылі, што сяляне як-небудзь пракормяцца – з агародаў, ад каровак. Першай запаведдзю было забяспечыць горад, выканаць свой абавязак перад дзяржавай*» [1].

В. Быкаў удала перадае змены ў адносінах да сялянства: новае кіраўніцтва ўспрыняло вяскоўцаў як рудымент, спадчыну гнілога царызму. «*Азевіч ужо пазнаў розніцу паміж сялянамі і рабочымі, носьбітамі пралетарскай свядомасці. Гэтыя апошнія былі куды вышэй коштам, іх хвалілі, вылучалі ў авангард, пра іх колькі вунь пісаў Ленін. Зноў жа – дыктатура пралетарыяту. А што сялянства? Дробнаўласніцкая ідэалогія...*» [1].

Аднак з цягам часу ідэалагічны тэрор распаўсюдзіўся на ўсе пласты грамадства. У творы натуральна перададзена адмасфера рэпрэсій, гвалту, адчуванне жывёльнага страху. Чырвоная далонь ужо даўно карае без разбору, а выканаўцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

страшнай волі з задавальненнем выконваюць крывавыя загады. У віры пераменлівага лёсу не засталіся без «увагі» і свае: «*Рабіў, як пракляты, у райкоме, ночай не спаў, недаядаў, лётаў па раёне. Калектывізацыя, індустрыялізацыя, барацьба класавая. А што зарабіў? Турму. Знаеш, як мяне там білі? Гумовым шлангам па нырках, алоўкі між пальцаў заціскалі. Ды яшчэ прызнавайся ім чорт ведае ў чым. Што ў арганізацыі беларускіх фашыстаў састаяў. Нідзе я не састаяў – я быў чэсны бальшавік! Бядняцкі сын. Інвалід з дзяцінства*» [1].

В. Быкаў паказвае, як змены адбіліся на розных пластах грамадства: ад трансфармацыі ўхіліцца немагчыма, кожны чалавек «перарабляецца», набывае новыя рысы або знікае бясследна. Азевіч, тыповы прадстаўнік маладога пакалення беларускага сялянства, сутыкаецца з рэаліямі новага жыцця і ўсё больш і больш адчужаецца ад роднай вясковай стыхіі. Свядомасць героя ламаецца пад ціскам такіх жа зламаных людзей, яны забруджваюць сумленне Азевіча, робяць яго саўдзельнікам самых жорскіх і ганебных падзей.

Наймацнейшы ўплыў на юнака аказвае каханне да натхнёнай бальшавічкі Паліны Пташкінай. Дзяўчына карэнным вобразам адрозніваецца ад прадстаўніц сялянскай грамады. Паліна сваімі паводзінамі транслюе прагу да незалежнасці, волі, жыцця, пазбаўленага стэрэатыпаў. «*Паліна. Тая была намеснікам камсамольскага сакратара ды іншым разам кіравала заняткамі. Мабыць, яна была старэйшая за Ягора, хоць і не нашмат, але выглядала зусім маладой дзяўчынай з нейкім востранькім, праніклівым позіркам, які не то дражніў, не то ўвесь час нешта выпрабоўваў у субяседніку. І часта ўсміхалася. Ягор тайком любаваўся ёю, асабліва як яна выступала ці расказвала пра ленінскія запаветы. Працавала яна ў жаночым аддзеле і была намесніцай загадчыцы, старой бальшавічкі Іды Шацман*» [1].

Вольныя паводзіны Пташкінай супрацьпастаўляюцца замацаваным у сялянскім светаўспрыманні ўяўленням пра жанчыну. Калі раней аснову жаночага дабрабыту складалі гаспадарка і сям'я, то «новая» дзяўчына імкнецца да самаўдасканалення шляхам ідэалагічнай барацьбы. Паліна смела сцвярджае магчымасць вольнага кахання, не абмежаванага шлюбам ці згодай бацькоў. Дзяўчына карыстаецца памкненнямі маці-прыроды, звяртаецца да першабытнай вольнай пачуццёвасці.

Яна адначасова вабіць і палохае Ягора: «*Невядома, колькі ён спаў, але прабудзіўся раптоўна і амаль спалохана – хтосьці да яго дакрануўся, ці што. Ягор, прахапіўшыся, спрабаваў сесці, ды пачуў знаёмы сціішаны голас: «Ну чаго, чаго, ляжы, дурненькі... Напалохаўся? Пасунься крыху...» Ён ледзьве не задыхнуўся ад хвалявання, пасунуўся і ляжаў, змярцвеўшы ад новага невядомага пачуцця, якое раптоўна ахапіла яго. У думкі нечакана шыбанула пытанне*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*«Навошта?», але яно тут жа і аслабла без адказу, бадай знікла. Вялікая няёмкасць асталася, ды Паліна, бы не адчуваючы ніякай няёмкасці, ужо ўладкоўвалася пад касматай палой кажуха, гулліва шэпчучы яму ў самае вуха: «Не палохайся, не палохайся, я не мядзведзь, не з'ем цябе, такога вялікага. Хачу пагрэцца каля цябе, а то напаілі і кінулі аднаго ў гэтую лядоўню... Ну, пагрэй мяне...»* [1].

Хутка праявіўся цёмны бок гэтага кахання. Ведаючы пра свой прыродны магнетызм, Пташкіна не саромелася карыстацца дзявочым хараством дзеля дасягнення ўласных мэтаў. Прыгажуня пераконвае Азевіча падпісаць ганебны данос на ўласнага кіраўніка, чалавека, які лагодна і гуманна ставіўся да хлопца. «*– Во табе папера, во аловак. Сядай і ўсё напішы. Я чакаю». – «Нашто?» – зусім здзіўлена вымавіў ён. «На тое, – адказала яна сур'ёзна, без усмешкі паглядаючы на яго. – Ну, я чакаю». Ён няўцямна пазіраў на белы аркуш паперы са сшытка ў клетку, не разумеў, што рабіць. «Дык гэта, я заўтра напішу», – сказаў ён і ўсміхнуўся. Але яна зноў надта сур'ёзна зазначыла: «Не, ты напішаш зараз. Я чакаю», – і ўтаропілася ў яго сваімі цёмнымі, надта прыгожымі вачыма, у якіх цяпер была нецярплівасць і нават незразумелая непрыязь да яго. «Ну, пачынай!» – «Ды не магу я!» – «Ах, не можаш? Тады я сама напішу. Давай аловак*» [1]; «*Ягорка, ну! Зрабі тое для мяне! – зазірнула яна яму ў вочы і нават мякка дакранулася да ягоных валасоў. – Ну, для нашага кахання. Мы ж так кахаліся... Помніш? Падпішы тут, і ўсё». – «А Зарубу што будзе?» – «Ды нічога яму не будзе, дзівак ты! Ну, можа, вымова. За страту пільнасці. Ну?..*» [1].

Дадзены ўчынак разбурае асобу хлопца, ён не можа больш жыць у гармоніі з уласным сумленнем, юнак фактычна страчвае ўсякую волю да змагання за сваю праўду. У цяжкім маральным стане хлопец часта параўноўвае дэманічную постаць Паліны са сваёй колішняй каханай – Настачкай. Сціплая і сарамлівая дзяўчына ўжо не падаецца яму цікавай і прывабнай. Яго з нястрымнай сілай вабіць кідкая прыгажосць і яскравы характар новай каханкі. «*Але хіба можна было параўнаць Настачку з Палінай? Варта было паслухаць, як гэтая выступае перад сялянамі, нават лепш за Зарубу. Той нібы граў на гармоніку – басавіта і патрабавальна, а Паліна – нібы на скрыпачцы – сардэчна, дужа пераканаўча, нават пранізліва, асабліва як звярталася да жанчын і абяцала ім шчаслівую долю. Тады здавалася, Паліна ўжо бачыць тую долю і вось-вось раздасць яе ўсім жанчынам і дзеўкам, што сабраліся ў той хаце. Толькі трэба было ўступіць у калгас, іншай дарогі для савецкіх жанчын няма. Па заканчэнні яе прамовы вясковыя дзеўкі дружна білі ў ладкі. Мужчыны, аднак, сядзелі не крануўшыся. У мужчын быў свой клопат*» [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аднак, дасягнуўшы сваёй мэты, рэвалюцыянерка страчвае цікавасць да Азевіча. Юнак з болем пераносіць гэты вопыт, яму брыдка ад таго, што, апантаны ілюзорным каханнем, ён адправіў нявіннага чалавека ў рукі катаў. «*Вельмі шкада яго было Азевічу, і тачыў маўклівы дакор сабе, што і ён неяк дачыніўся да ягонай пагібелі. Хай не сам, не па сваёй волі, лічы, цераз прынуку. Паліна!.. Во хто быў ягоны найбольшы боль і загадка, можа, на ўсё яго далейшае жыццё. Што гэта за чалавек, Паліна? Што за жанчына? Чаму яна так паставілася да яго, вясковага хлопца з яго неразбэшчаным даверам*» [1].

В. Быкаў паказвае, наколькі разбуральна ўплывае новая ідэалогія на псіхічную здольнасць чалавека да пачуццяў. Жывая, цікаўная да свету істота ператвараецца ў апрацаваны прадукт знішчальнай сістэмы.

Жыццё Азевіча ў апошні раз асвяцілася каханнем падчас сустрэчы з маладой суседкай Анэляй. Дзяўчына фактычна прадстаўляе сабой яшчэ адзін варыянт новай жаночай постаці. Гэты вобраз з’яўляецца гарманічным сімбіётам вясковай Настачкі і бальшавічкі Паліны. Анэля мае вольнадумства і прагу да жыцця, што ўласціва Пташкінай, аднак разам з гэтым увасабляе народныя ўяўленні пра дзявоцкую чысціню і хараство.

Аднак скалечанае светаўспрыманне Азевіча спачатку не дае яму засяроддзіць увагу на лепшых баках асобы Анэлі, ён ужо прывык успрымаць чалавека перш за ўсё з пункта гледжання класава-сацыяльнай прыналежнасці: «*Ты – камсамолка?» – запытаў Ягор. «Неа, – сказала яна. – Хто мяне прыме такую», – і кораценька засмяялася, няўмела стаіўшы ў тым смеху свой трудны клопат. Ён не пярэчыў, сапраўды, з такім, далёка не пралетарскім паходжаннем не шмат чаго даб’ешся ў жыцці. Гэта горш, чым сялянскае паходжанне. Чым нават серадняцкае. Тут, лічы, амаль што кулацкім пахне. Калі не горай*» [1].

Фінал такога кахання, вядома, трагічны: бацьку дзяўчыны хапаюць бальшавікі, на Анэлі цяпер таўро – «дачка ворагу народа». Азевіч не можа дазволіць сабе падтрымліваць адносіны з такой «ненадзейнай» асобай. «*Ён не бачыў яе, можа, месяц ці болей, а як аднойчы сустрэўся ў мястэчку каля базару, дык перайшоў на другі бок вуліцы. Ён баяўся сустрэчы з ёй і яе бядой, як баяцца спатыкаць радню нябожчыка ці злачынца*» [1].

У плынь лёсу Ягора неспадзяваны ўрываецца вайна. Хлопец трапляе ў жорсткія ўмовы, паступова вочы яго расплюшчваюцца – Азевіч пачынае даваць цвярозую ацэнку свайму жыццю: «*Людзі! Што з імі рабілі і яшчэ ад іх чагосьці чакалі. Усе гады markdown*

*вялікіх і не надта разумных, часам надуманых, а то і бязглуздых планаў. Хутчэй матэрыялам, з якога ляпілі розныя прыдуманыя кімсьці фігуры, не дбаючы, а ці трэба людзям тая лепка і тыя фігуры»* [1].

Выпадковая сустрэча з добразычлівай жанчынай прыносіць супакой у зруйнаваную душу хлопца. Думаецца, вобраз нечаканай спадарожніцы – глыбока сімвалічны, яна, нібы ўвасабленне жаночкай спагадлівасці, пяшчоты, павагі да незнаёмай, скалечанай асобы, адсылае чытача да сакральнага вобраза маці, які суадносіцца з вобразам маці-Радзімы. Такая сустрэча аднаўляе ў сэрцы героя памкненні да змагання, барацьбы, подзвігу, але не ў гонар партыі, а дзеля сапраўды вольнай будучыні, пазбаўленай камуністынага «шчасця».

Такім чынам, увасабленне тэмы кахання ў творы мае сваю спецыфіку. Пачуцці галоўнага героя разгортваюцца на фоне сацыяльных пераўтварэнняў. Аўтар паказвае, як адмаўленне ад спрадвечных духоўна-маральных каштоўнасцей уздзейнічае на чалавека і змяняе яго стаўленне да кахання, жанчыны, сям'і.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *Літаратура*

1. Быкаў, В. Сцюжа [Электронны рэсурс] / В. Быкаў // Беларуская палічка: беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Vasil_Bykau/Sciuzha.html. – Дата доступу: 17.03.2018.